# Замест эпілога

Перагорнута апошняя старонка кнігі «Памяць. Слаўгарадскі раён». Кнігі, якая стала свайго роду раённай энцыклапедыяй, у якой асветлены вялікі жыццёвы шлях многіх пакаленняў слаўгарадцаў, шлях абнаўлення жыцця, барацьбы за свабоду і незалежнасць нашага народа ў розныя гістарычныя перыяды.

Старэйшаму пакаленню давялося перанесці не адно выпрабаванне, перажыць горыч страт і радасць перамог. Сваёй ратнай і мірнай працай яго прадстаўнікі імкнуліся тварыць зямное дабро і абаранялі яго ў імя будучага нашага жыцця.

Мы схіляем галовы перад памяццю нашых землякоў і многіх іншых заслужаных людзей, звязаных лёсам са Слаўгарадчынай. Яны дастойна выканалі свой грамадзянскі і вайсковы абавязак перад народам і Радзімай.

Агульным болем і чарговым выпрабаваннем стала для нас Чарнобыльская катастрофа. Нанесены невымяральны ўрон здароўю людзей, вытворчай і сацыяльнай сферам. У гэтых экстрэмальных умовах пытанні сацыяльнай абароны грамадзян, іх бяспечнага пражывання на тэрыторыі, пацярпеўшай ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, сталі прыярытэтнымі ў дзейнасці органаў мясцовай улады.



І ўсё ж, нягледзячы на пэўныя цяжкасці, райвыканком прыняў адпаведныя меры па завяршэнні работы і выданні доўгачаканай кнігі «Памяць».

У стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі прымалі актыўны ўдзел ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, вучоныя-гісторыкі, пісьменнікі і журналісты-землякі, жыхары раёна і іншыя. Усім, хто прымаў удзел у падрыхтоўцы і выданні кнігі «Памяць», выказваем шчырую падзяку і жадаем добрага здароўя і творчых поспехаў. Спадзяемся, што ў будучай гісторыі Слаўгарадчыны пастаяннымі спадарожнікамі будуць стваральная праца, дабрабыт, шчасце і радасць на доўгія гады.

*В.В.Берастаў,*
*старшыня Слаўгарадскага райвыканкома.*